**Л.І.Доўнар,**
*супрацоўніца бібліятэкі*
*БДУ культуры*

# ВЫДАННЕ РЭЛІГІЙНЫХ КНІГ У МІНСКУ ў XIX – пачатку XX ст.

Выданне рэлігійных кніг у Мінску звязана ў асноўным з гісторыяй і дзейнасцю праваслаўнай і каталіцкай царквы, у некаторай ступені з іудзейскай. У 1795—1864 гг. яно складала 27 %, у 1865—1904 гг. – 8 %, у 1905—1917 гг. – 3 % ад агульнай колькасці кніжнай прадукцыі адпаведнага перыяду. Да 1864 г. пераважалі рэлігійныя кнігі па каталіцызме на польскай і лацінскай мовах, а таксама па іудаізме на іўрыце, ідыш і рускай мове. Пасля 1864 г. у выданні рэлігійных кніг адбываюцца змены: назіраецца агульны спад, ва ўсёй колькасці выданняў; пачынаюць пераважаць праваслаўныя рускамоўныя выданні. Аднак і па мэтавым, і чытацкім прызначэнні выпуск рэлігійных кніг павялічваўся, змест іх напаўняўся і пашыраўся за кошт мясцовай тэматыкі. Аналізуючы агульны паток мінскіх рэлігійных выданняў XIX – пачатку XX ст., якія колькасна складаюць больш за 250 экземпляраў, можна вылучыць пэўныя комплексы, якія маюць сваё чытацкае прызначэнне. Для іх характарыстыкі намі выкарыстана "Универсальная десятичная классификация. 2 Религия" (СПб., 1996), распрацаваная ў С.-Пецярбургскай духоўнай акадэміі. Значная дапамога аказана нам і вопытным сістэматызатарам рэлігійнай кнігі Т.А.Самайлюк, якой мы выказваем удзячнасць.

Згодна з гэтай класіфікацыяй, рэлігійныя кнігі, выдадзеныя ў Мінску ў XIX – пачатку XX ст., складаюць наступныя комплексы: *хрысціянства* (біблейская гісторыя, хрысталогія, патралогія, гісторыя царквы, багаслоўе, літургіка, царкоўныя спевы, гамілетыка, вучэбныя кнігі, кананічнае права, мастацкія творы); *іудаізм* (біблейская



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гісторыя, гісторыя іудаізму, багаслоўе, рытуальныя абвінавачванні, равінская літаратура і песнапенні).

Па біблейскай гісторыі ў Мінску ў 1877 г. у друкалітаграфіі Б.І.Саламонава пачала выдавацца "Священная история Ветхого Завета в простых рассказах для детей младшего возраста" Ф.І.Міткевіча, якая вытрымала рэкордную колькасць перавыданняў (да 1915 г. – 19). Некаторыя з гэтых выданняў выходзілі ў друкарні С.А.Някрасава (1905), а таксама ў губернскай друкарні (1908, 1913). У 1878 г. у друкалітаграфіі Б.І.Саламонава была выпушчана ўжо наступная кніга "Священная история Нового Завета".

Хрысталогія прадстаўлена двума мінскімі каталіцкімі выданнямі 1830 г. і 1850 г. Выданне 1830 г. францысканца Банавентуры "Żywot Pana i Boga Naszego Jezusa Chrystusa..." было перадрукам з асобніка, выдадзенага кармелітамі ў 1822 г. у Бярдзічаве. Другое выданне пад той жа назвай было занатавана ў бібліяграфічным спісе з кнігазбору беларуска-польскага пісьменніка Ул.Сыракомлі як выданне 1850 г.

Па патралогіі вылучаюцца дзве мінскія праваслаўныя кнігі, у якіх асветлены жыццё і дзейнасць такіх айцоў царквы, як Кіпрыян (1900) і Нямезій, епіскап Эмескі (1909).

Гісторыя царквы – найбольш значны комплекс мінскіх рэлігійных кніг. У ім вылучаюцца выданні і па гісторыі праваслаўнай царквы, і па гісторыі каталіцкай царквы. Да прац агульнага характару па гісторыі праваслаўнай царквы можна аднесці такія, як "Борьба за святое православие" (1907), "История христианской православной церкви в общедоступных рассказах" Ф.Міткевіча (1888); творы, прысвечаныя дзейнасці рускіх пастараў (Дзмітрыя Растоўскага, мітрапаліта Святагорца Дзянісія Афонца). Да прац агульнага характару па гісторыі каталіцкай царквы адносяцца два выданні: "Zapowiedzenie powszechnego jubileuszu lata miłościwego tysiącznego ośmsetnego dwudziestego szóstego miesiąca maja dnia 2. w Rzymie MDCCCXXIV z drukarni Kamery Apostolskiej" (1826), у якім змяшчаўся



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матэрыял па Мінску і Мінскай дыяцэзіі (епархіі) на польскай мове, і "Главенство пап во время Виленских соборов" А.Юрашкевіча (1912) на рускай мове.

Асноўную ж частку мінскіх выданняў па гісторыі праваслаўнай царквы складаюць кнігі і брашуры па гісторыі праваслаўнай царквы Беларусі. Сярод аўтараў выданняў агульнага характару — архімандрыт, інспектар Мінскай духоўнай семінарыі, епіскап Беларускі і Магілёўскі Анастасій (Апоцкі), архімандрыт Слуцкі Афанасій (Вячорка), архімандрыт Макарый і інш.

Мінскія выданні па гісторыі праваслаўнай царквы Беларусі прадстаўлены толькі невялікай групай агіяграфічных кніг. Гэта жыццяпісы такіх беларускіх святых, як Еўфрасіння Полацкая (1910), Соф'я Юр'еўна Алелька (1912), Гаўрыіл Слуцкі (1912).

У шматлікіх мінскіх рэлігійных выданнях адлюстравалася гісторыя Мінскай епархіі. У групу гэтых выданняў увайшлі працы, прысвечаныя дзейнасці мінскіх архіепіскапаў Віктара (Садкоўскага), Антонія (Зубко), Аляксандра (Дабрыніна), Міхаіла (Цемнарусава); "Материалы..." і "Очерки..." да гісторыі Мінскай епархіі С.Г.Рункевіча; гісторыка-статыстычныя і даведачныя выданні А.В.Таварава, а таксама "Хронологический и систематический указатель статей, напечатанных в Минских епархиальных ведомостях (1867—1897 гг.)" у двух частках святара І.Пастарнацкага.

У шэрагу выданняў па гісторыі праваслаўнай царквы Беларусі вылучаюцца выданні мінскіх друкарняў, прысвечаныя гісторыі беларускіх храмаў, асабліва Мінскай епархіі. Гэта такія працы, як "Православные святыни города Минска" пратаіерэя Паўла Афонскага (1889), "Описание церквей и приходов Минской епархии..." у 9-ці выпусках, складзеных па афіцыйных звестках па Мінскім, Барысаўскім, Слуцкім, Мазырскім, Пінскім, Бабруйскім, Рэчыцкім і Навагрудскім паветах, 1878—1879. Асобныя працы, якія друкаваліся як адбіткі з "Минских епархиальных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ведомостей", адлюстроўвалі гісторыю пэўных храмаў (Мінскага Свята-Духава мужчынскага першакласнага манастыра, Мінскага кафедральнага Петрапаўлаўскага сабора, Пінскага Ляшчынскага манастыра, Пінскага Богаяўленскага манастыра).

Гісторыя духоўных навучальных устаноў таксама была аб'ектам для апісання. Значнае месца займае праца М.І.Вержбаловіча "История Минской духовной семинарии" (у двух выпусках: "Дореформенный период" і "1817—1840 гг." (1893) — са спісамі службовых асоб семінарыі з 1785 г. да 40-х гг. XIX ст. з кароткімі біяграфічнымі звесткамі), а таксама іншыя працы, прысвечаныя Мінскай духоўнай семінарыі, духоўным вучылішчам і царкоўна-прыходскім школам.

Сярод мінскіх рэлігійных выданняў ёсць група выданняў, што асвятляюць дзейнасць з'ездаў духавенства, напрыклад Мінскага епархіяльнага з'езда, а таксама матэрыялы і справаздачы аб правядзенні брацкіх з'ездаў.

Даволі значную групу выданняў па гісторыі праваслаўнай царквы Беларусі складаюць статуты і справаздачы брацтваў (Мінскага праваслаўнага Мікалаеўскага брацтва; брацтва Казанскай прывакзальнай царквы ў г.Мінску; Мінскага праваслаўнага народнага брацтва; Кірыла-Мяфодзіеўскага брацтва пры царкве Мінскай духоўнай семінарыі; Стараельнянскага царкоўнага брацтва ў імя новаяўленага цудатворцы, прападобнага Серафіма Сароўскага); епархіяльных апякунстваў, епархіяльнай вучылішчнай рады.

Выданні па гісторыі каталіцкай царквы Беларусі не адрозніваюцца такой разнастайнасцю, як выданні па гісторыі беларускай праваслаўнай царквы. Іх тры: першае "Do duchownego i swieckiego stanu: Od Towarzystwa dobroczynności w Mińsku" (1811) – адозва, складзеная Я.Ходзькам; другое і найбольш значнае "Dzieje Dyecezyi Mińskiej w Zarysie" А.Ельскага (1907), якое ўяўляла сабой нарыс гісторыі Мінскай каталіцкай епархіі; трэцяе – "Krótki zarys dziejów

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

kosciołа, zbudowanego na cmentarzu katolickim w miasteczku Iwieniec gubernji Mińskiej" (1909) – кароткі ілюстраваны нарыс па гісторыі Івянецкага касцёла.

Раздзел "Багаслоўе" прадстаўляюць адзінкавыя мінскія выданні па дагматычным багаслоўі ("Ясное в науке и неясное в религии" настаяцеля царквы, законанастаўніка гімназіі, пратаіерэя Андрэя Юрашкевіча, 1905); параўнальным багаслоўі ("О католической вере к уклоняющимся в католичестве", 1908; "Что такое индульгенция" А.Юрашкевіча, 1909; "Ответы католикам по вопросам веры", 1909; "Беседа с православными, живущими среди католиков" епархіяльнага месіянера Л.Мулера, 1914); маральным багаслоўі (адно каталіцкае – "Obraz sprawiedliwości i doskonałości. S.Jana", 1820; адно праваслаўнае – "Две ночи и два дня из жизни богочеловека, господа и спасителя нашего Иисуса Христа: размышления христианина, посвященные юношеству" святара Мінскай епархіі Рамана Маскалевіча, 1877); па аскетыцы два каталіцкія выданні: "1826 rok pański pelen bogowych" Бернардына, 1825, і "Rok pański Pelen Bogomyślności Duszy Zakonney..." 1826).

Па літургічным багаслоўі ў Мінску было выдадзена толькі "Общедоступное объяснение богослужения православной церкви с текстом общеупотребительных церковных песнопений и чтений, переложенных на русский язык и с приложением песнопений из Октоиха и Минеи на славянском и русском языках" Ф.І.Міткевіча (1895).

Сярод богаслужбовых кніг, выдадзеных у Мінску, а гэта ў асноўным каталіцкія рэлігійныя кнігі, пэўную групу складаюць служэбнікі ("Directorium..." 1830, 1833, 1835,1836, 1841, 1843, 1848, 1849, 1853, 1854, 1856, 1858, 1863, 1864, 1866 гг. – паралельна на польскай і лацінскай мовах), службы Гасподскія і Багародзіцы: "Nabożeństwo..." (1828, 1831); "Officium..." (1830); "Majowa nowenna..." (1861); малітоўнікі: "Złoty ołtarzyk" (1826); "Ołtarz (złoty cały)..." (1829, два выданні); "Повседневные молитвы с краткими катехизическими

вопросами и ответами" (1912); асобныя малітвы ("Ojcze nasz", 1854) на польскай і царкоўнаславянскай мовах.

Па царкоўных спевах вядомыя шэсць выданняў, тры з якіх на польскій мове ("Pieśni nabożne...", 1826, 1830; "Pieśn poranna", 1830), а тры на рускай ("Сборник церковных песнопений с переводом их на русский язык" настаяцеля сабора, пратаіерэя Уладзіміра Успенскага, 1908 г. і 1909 г., і "Православные молитвы и песнопения по исходе души от тела и при поминовении усопших", 1909), выпушчаныя ў якасці дадатка да "Братского листка" Мінскага праваслаўнага народнага брацтва ў імя жыватворнага крыжа Гасподня. Сярод выданняў па царкоўных спевах былі таксама каталіцкія спеўнікі.

*Вучэбныя кнігі.* У першай палове XIX ст. у Мінску выдаваліся каталіцкія катэхізісы ("Nauka czytania pisma polskiego dla małych dziatek z róznem nabożeństwem i katechizmem..." (1831, 1835), "Krótki katechizm kościoła rzymsko-katolickiego" С.Фялінскага (1862), а ў другой палове выйшлі працы законанастаўніка Мінскай жаночай гімназіі і жаночага 3-класнага вучылішча святара Ф.Міткевіча «Вопросы для повторения уроков по учебнику протоиерея А.Лаврова "Первоначальное учение о главных истинах христианской православной веры» (1888), "Объяснения праздников и постов православной церкви для детей младшего школьного возраста" (1888, 1889, 1897, 1901), "История христианской православной церкви в общедоступных рассказах, составленная применительно к программам городских училищ и церковно-приходских школ" (1889, 1895, 1901).

Адзін са шматлікіх комплексаў мінскіх рэлігійных выданняў — "Гамілетыка". У ім можна, у сваю чаргу, згрупаваць выданні па прамовах (казаннях або пропаведзях), словах, пастарскіх пасланнях. Каталіцкія казанні ("Kazanie", "Mowa") былі прысвечаны як урачыстым актам (узвядзенне на пасаду мінскага епархіяльнага епіскапа М.Ліпскага ў 1833 г.;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прынящце манаства К.Залюцінскай і П.Свентаржэцкай у 1800 г.), так і жалобным набажэнствам па Аляксандры І у 1825 г., асвячэнню мінскіх могілак (1800).

Праваслаўныя прамовы, якія з'яўляліся ў асноўным адбіткамі з "Минских епархиальных ведомостей", адлюстроўвалі падзеі адкрыцця і асвячэння храмаў, капліц, таварыстваў (1869, 1870, 1871); прамоў пасля прывядзення да прысягі міравых суддзяў (1872), прамоў-наказаў ваенным (1877), прамоў перад паніхідай (1886). Асноўную іх частку складаюць прамовы архіепіскапа Мінскага і Бабруйскага Аляксандра (Дабрыніна Андрэя Васільевіча), які займаў гэтую пасаду ў 1868—1877 гг.

У якасці аўтараў слоў выступала больш шырокае кола асоб – гэта архіепіскап Мінскі і Тураўскі Яўгеній (Шарашылаў), архіепіскап Мінскі і Бабруйскі Аляксандр (Дабрынін), епіскап Мінскі і Тураўскі Мітрафан (Краснапольскі), архімандрыт, інспектар Мінскай духоўнай семінарыі Анастасій (Апоцкі), пратаіерэй Андрэй Юрашкевіч, святар Мінскай епархіі Канстанцін Акаловіч, выкладчык семінарыі, царкоўны стараста Аляксандр Таварау і інш. Акрамя збораў слоў і прамоў, тэматыка асобных выданняў слоў прысвячалася асвячэнню храмаў, царкоўным і свецкім святам, словам аб фізічным і маральным здароўі.

У пачатку XIX ст. у Мінску была зроблена спроба выдання такіх гамілетычных твораў, як пастырскія пасланні. Іх аўтарам быў першы епіскап Мінскай дыяцэзіі Я.Дзядзерка (1798—1816): "List pasterski o powołaniu godności kapłańskiej" (1800), "List pasterski wszystkim wiernym" (1805), "List pasterski w którym osądzoneby były siostry Miłosierdzia" (1810), "Wezwanie do założenia szpitala" (1810).

Па кананічным праве вядома адно мінскае выданне, прысвечанае правілам службы памінальных літургій і паніхід праваслаўнага абраду А.В.Таварава (1901).

У 1848 г. В.Газдзіцкім была выдадзена і адзіная мінская мастацкая рэлігійна-рамантычная паэма на польскай мове "Obraź z obrazów uczuć ludzkich".



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Найбольшая колькасць мінскіх іудзейскіх твораў, якія выдаваліся ў асноўным у друкарні Г. Бланштэйна, прадстаўлена біблейскай гісторыяй. Гэта такія выданні, як “Агада Пасхальная з тлумачэннем” (1816, 1833) на іўрыце і ідыш; “Дом Ізраіля: Крыніцы да каментарыя з Мідраша, Міхільты, Вавілонскага і Іерусалімскага Талмуда” (1836) І.Егошуа на іўрыце; “Запавет Аўраама і Міласэрнасць Аўраама” (1836) А.Гурвіца; “Шлях разумення” (1836) М.Х.Луката на іўрыце.

Па гісторыі іудаізму ў Беларусі можна адзначыць такія выданні мінскіх друкароў, як справаздачы аб дзейнасці Мінскай талмуд-торы і справаздачы аб дзейнасці праўлення малітоўнай школы “Бес Гамедрэш” у Мінску, якія выпускаліся на рускай мове. Адным з актыўных аўтараў багаслоўскіх выданняў па іудаізме на рускай мове з’яўляўся мінскі рабін А.Я.Гурвіч. Так, адна з яго прац “Злостный навет” (1911) была прысвечана рытуальным абвінавачванням, яшчэ дзве – агульным даследаванням па іудаізме: “Иудаизм и свободомыслие: Историко-критический этюд” (1912), “Почему книжка “Эстер”, хотя и светского характера, включена в состав Св.Писания?” (1910). Параўнальныя даследаванні, як і аўтарства равінаў, характэрныя для мінскіх выданняў па іудаізме.

Равінская літаратура, што адпавядала хрысціянскай гамілетыцы, якая была таксама на рускай мове, заняла больш значнае месца ў мінскай выдавецкай дзейнасці, чым іншыя. Першае вядомае мінскае выданне такога кшталту адносіцца да 1862 г. Гэта “Глас радости: Речь по случаю высочайше дарованных в 27 день ноября 1861 г. преимуществ евреям...” мінскага равіна З.Мінора. Прамова была сказана ў Мінскім вялікім малітоўным доме (Шаба Круім) на рускай мове. Занатавана яшчэ адна надрукаваная прамова рабіна А.Я.Гурвіча, сказаная ў Харальнай сінагозе Мінска на свята Макавеяў у 1907 г. Адзначаны ў мінскім друку і тры сінагагальныя словы рабіна А.Ханелеса (з

выпадку каранавання Мікалая II і Аляксандры Фёдараўны ў 1896 г.); слова рабіна А.Я.Гурвіча пры адкрыцці ў Мінску Харальнай сінагогі ў 1906 г.; слова А.Рэмеза аб ліквідацыі прычын дрэннага становішча яўрэяў у абноўленай Расіі ў 1908 г. У 1832 г. у друкарні Г.Э.Бланштэйна было перадрукавана з зальквінскага выданне 1822 г. рэлігійных спеваў на іўрыце "Зборнік песень", складзены М.Г.Летэрысам.

Такім чынам, у адпаведнасці са згаданай класіфікацыяй мінскія рэлігійныя кнігі XIX – пачатку XX ст. прадстаўлены амаль у кожным раздзеле. Аснову склалі рэлігійныя выданні па гісторыі царквы, асабліва па гісторыі беларускай праваслаўнай царквы. Тут вылучаюцца наступныя комплексы: літаратура агульнага характару, агіяграфія, гісторыя Мінскай епархіі, гісторыя беларускіх храмаў, гісторыя духоўных навучальных устаноў, з'езды духавенства, статуты і справаздачы. Другое месца занялі рэлігійныя выданні па гамілетыцы: прамовы (казанні, пропаведзі), словы, пастарскія пасланні, равінская літаратура. На трэцім месцы – выданне богаслужбовых кніг, асабліва каталіцкіх: служэбнікаў, службаў Гасподскіх і Багародзіцы, малітоўнікаў.

Асноўнымі друкарнямі ў Мінску, якія займаліся выданнем рэлігійных кніг, былі друкалітаграфія Б.І.Саламонава (53 рэлігійныя выданні); Мінская губернская друкарня (19); друкарні С.А.Някрасава (43), І.У.Стэфановіча (14), Ё.Дворжаца (7), Г.Э.Бланштэйна (6). Наогул жа рэлігійныя кнігі на працягу XIX – пачатку XX ст. выходзілі ў 18-ці друкарнях Мінска.

Пад'ёмы ў выданні рэлігійных кніг у Мінску адзначаюцца ў 1826, 1836, 1869, 1870, 1877, 1879, 1880, 1888, 1890, 1900, 1908, 1909, 1912 гг. Найбольш кніг было выпушчана ў 1909 г. – 17 праваслаўных рэлігійных выданняў. Выданню рэлігійных кніг спрыялі архіепіскапы Аляксандр (Дабрынін), Яўгеній (Шарашылаў), Міхаіл (Цемнарусаў), епіскап Мітрафан (Краснапольскі). Аўтарамі мінскіх рэлігійных кніг XIX –



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пачатку XX ст. былі ў асноўным святары, выкладчыкі духоўных навучальных устаноў, настаўнікі закона Божага. Рэлігійныя выданні XIX – пачатку XX ст. у Мінску склалі 8% ад агульнай колькасці выдадзенай кніжнай прадукцыі ў гэты час у горадзе.

**Э.С.Дубянецкі,**
*кандыдат гістарычных навук*

## МЕНТАЛЬНАСЦЬ І НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА: СУТНАСЦЬ УЗАЕМАЎПЛЫВАЎ І ПРАБЛЕМЫ РАЗВІЦЦЯ

У сферу ментальнасці арганічна ўваходзяць свядомыя і падсвядомыя ўстаноўкі, імпульсы, калектыўныя першавобразы (архетыпы, паводле тэрміналогіі К.Г.Юнга), рацыянальныя і эмацыянальныя імкненні, прыродныя і сацыяльна-культурныя, індывідуальныя і грамадскія ўяўленні, арыентацыі. Асноўнымі структурнымі адзінкамі (элементамі) менталітэту з'яўляюцца ўяўленні аб прасторы і часе, рэлігіі, чалавеку і грамадстве, а таксама аб Радзіме, жыцці, працы, сям'і, каханні, інтымных адносінах, праве і інш. Менталітэт вызначаецца дастаткова высокім узроўнем стабільнасці, унутранай маналітнасці і захоўваецца амаль нязменным на працягу многіх стагоддзяў.

Гістарычная эвалюцыя менталітэту звычайна адбываецца больш марудна ў параўнанні са зменамі ў эканамічнай і палітычнай сферах. Важнымі фактарамі ў станаўленні менталітэту выступаюць прыродна-біялагічны, звязаны з генафондам народа, прыродна-кліматычнымі і ландшафтнымі ўмовамі; сацыяльны, які выяўляецца ў спецыфічных рысах сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і культурнага жыцця, асаблівасцях сацыяльнай